4. *Макарян А. М.* О сатире. М., 1967. 273 с.
5. *Клушина Н. И.* Стилистика публицистического текста. М. : Медиа-Мир : Факультет журналистики МГУ, 2008. 242 с.
6. *Сергиенко А. В.* Языковые возможности реализации иронии как разновидности импликации в художественных текстах: автореф. дис. … канд. филол. наук. Саратов, 1995. 18 с.

# УРОКІ ЖУРНАЛІСЦКАГА МАЙСТЭРСТВА НА СТАРОНКАХ «МІНСКАЙ ПРАЎДЫ» 50-х гг. XX ст.

***П. Л. Дарашчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*pdoroshhyonok@mail.ru*

Даследуюцца публікацыі абласной газеты «Мінская праўда» 50-х гг. XX ст., накіраваныя на ўдасканаленне ідэйна-тэматычнага зместу і мовы раённых газет, перадач заводскага радыё і насценгазет, якія выходзілі на тэрыторыі Міншчыны.

***Ключавыыя словы:*** раённая газета; публіцыстыка; агляд друку; падрыхтоўка журналістаў; селькары.

# LESSONS OF JOURNALISTIC SKILLS ON THE PAGES OF THE «MINSKAYA PRAUDA» IN THE 50s OF THE XX CENTURY

***P. L. Doroshchenok***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: P. L. Doroshchenok (pdoroshhyonok@mail.ru)*

The article examines the publications of the regional newspaper «Minskaya Prauda» in the 50s of the XX century, aimed at improving the ideological and thematic content and language of local newspapers, broadcasts of the factory radio and wall newspapers published in the territory of the Minsk region.

***Key words:*** local newspaper; journalism; press review; training of journalists; local correspondents.

Другая палова 50-х гг. XX ст. – перыяд шырокай дэмакратызацыі грамадскага жыцця. У беларускую журналістыку ў гэты час уступалі выпускнікі першых набораў аддзялення журналістыкі філфака БДУ, на самім аддзяленні фарміравалася новая кагорта даследчыкаў гісторыі і тэорыі журналістыкі – М. Зярніцкі, Р. Булацкі, М. Цікоцкі, Н. Сніцарава, Б. Стральцоў, В. Дубовік, В. Пыжкоў і інш. З-за недахопу падручнікаў і дапаможнікаў майстэрняй журналісцкага слова станавіліся старонкі абласной газеты «Мінская праўда».

У журналістаў газеты сапраўды было чаму павучыцца рэдактарам і журналістам раённай прэсы, супрацоўнікам заводскага радыё, актывістам насценнага друку. Публікацыя на старонках абласнога выдання аглядаў друку, аналітычных матэрыялаў аб працы мясцовага радыё на прадпрыемствах дазваляла аператыўна рэагаваць на недахопы ў дзейнасці СМІ, паказваць вопыт лепшых. Так, у карэспандэнцыі «Агнём сатыры» газета расказвала пра дзейнасць насценных сатырычных газет («Крокодил», «Вожык», «Пылесос» і інш.) на Мінскім радыёзаводзе па выкрыцці рэцыдываў п’янства, асвятленні недахопаў бытавога абслугоўвання і іншых заганаў асобных членаў працоўнага калектыву [1].

Публікацыяй намнога больш буйнога «калібру» стаў крытычны артыкул «Увагу хімічнай прамысловасці», які быў апублікаваны пад рубрыкай «Агляд друку» 22 ліпеня 1958 г. Аналіз матэрыялаў «Творчы ўклад хімікаў», «У нашых шкловараў», «За далейшы рост і ўдасканаленне вытворчасці» і некаторых іншых, змешчаных на старонках газеты «За камунізм», органа Барысаўскага ГК КП Беларусі, гарадскога і раённага Саветаў, выявіў шэраг «недамовак» і недахопаў, якія істотна зніжалі вартасць надрукаваных матэрыялаў. Асабліва вострай крытыцы «Мінскай праўды» падверглася карэспандэнцыя Н. Ляўданскай і Л. Ерусалімчык «Завод гумаватэхнічных вырабаў павінен пакончыць з адставаннем». Як пісалі аўтары, «завод працуе нерытмічна, хранічнай з’явай сталі прастоі, марудна ідзе асваенне новых відаў прадукцыі, суправаждаемае іншы раз масавым бракам». У рэдакцыі «МП» выклікала здзіўленне, што аўтары не звярнулі ніякай увагі на высвятленне прычын выпуску няякаснай прадукцыі: «у карэспандэнцыі размова ідзе аб **масавым** браку, значыць не гаварыць аб прычыных яго ніяк нельга было» [2].

Крытычныя заўвагі ў гэтай публікацыі былі выказаныя барысаўскай газеце «За камунізм», каб падтрымаць выступленне групы работнікаў

лесахімзавода пад загалоўкам «Пытанні, якія чакаюць вырашэння». Адсутнасць неабходнай тэхнічнай дакументацыі, з-за якой зацягвалася будаўніцтва смоларазгоннага цэха, сур'ёзныя прэтэнзіі да няякаснай прадукцыі пастаўшчыкоў – гэтыя і іншыя праблемы завадчане не маглі вырашыць уласнымі сіламі. Дзейсным сродкам па выкрыцці недахопаў, па меркаванні «МП», мог бы стаць рабкараўскі рэйд па ўчастках Барысаўскага хімлясгаса. Але нават і праз паўтара месяца пасля апублікавання згаданага матэрыялу гэтыя праблемы так і не сталі прадметам далейшага абмеркавання на старонках раённай газеты.

Адзін з рэйдаў «Мінскай праўды» з удзелам рабочых карэспандэнтаў, супрацоўнікаў рэспубліканскіх маладзёжных газет і прадстаўнікоў газеты «Правда», праведзены ў кастрычніку 1958 г., стаў сур'ёзным экзаменам дзейнасці «Саюздруку» сталічнай вобласці і актывістаў распаўсюджвання друку ў Мінску і раённых цэнтрах. Надрукаваны па выніках рэйду матэрыял «Газеты і часопісы ў кожную сям'ю» («Правда», 15 кастрычніка; «Мінская праўда», 17 кастрычніка) выявіў не толькі дзясяткі прозвішчаў грамадскіх упаўнаважаных, якія выдатна спраўляліся са сваімі абавязкамі, але і сур'ёзныя хібы ў працы мінскага гарадскога аддзялення «Саюздруку», аддзяленнях сувязі асобных раёнаў. Як адзначалася ў публікацыі, «у Старобін нярэдка не дасылаюцца "Звязда" і "Известия", у Грэск і Труханавічы – "Звязда", "Советская Белоруссия", "Калгасная праўда"». Удзельнікі рэйду звярнулі ўвагу і на нездавальняючыя ўмовы працы – канторы і аддзяленні сувязі нярэдка туліліся ў цесных, неўпарадкаваных памяшканнях плошчай 5–6 кв. метраў, дзе прымалася падпіска, вялася сарціроўка газет і часопісаў.

У публікацыі «Важная тэма» пад рубрыкай «Агляд друку» «Мінская праўда» аналізавала матэрыялы раённых газет «За камунізм» (Барысаў) і «Калектывіст» (Чэрвень), прысвечаныя абмеркаванню Тэзісаў даклада М. С. Хрушчова да XIX з'езда партыі «Кантрольныя лічбы развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1959–1965 гг.», а таксама Тэзісаў ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб перабудове народнай адукацыі. У прыватнасці, паведамлялася, што газета «За камунізм» featured рознабакова паказвала ход абмеркавання тэзісаў, выданне выкарыстоўвала разнастайныя газетныя жанры і формы падачы матэрыялаў. Барысаўская раённая газета рэгулярна змяшчала выступленні кіраўнікоў прамысловых прадпрыемстваў, старшынь калгасаў, спецыялістаў і іншых няштатных аўтараў. Але, як адзначалася

ў аглядзе друку, ёсць газеты, якія недастаткова і бессістэмна асвятляюць ход перадз'ездаўскага абмеркавання тэзісаў. Напрыклад, на старонках чэрвеньскай газеты «Калектывіст» толькі зрэдку можна ўбачыць матэрыялы пра абмеркаванне гэтых найважнейшых для краіны задач. «Газеты павінны шырока выкарыстаць усё каштоўнае, што накоплена імі ў мінулыя гады, – падкрэслівалася ў аглядзе друку. – Са старонак газет павінна як мага часцей гучаць слова радавога савецкага чалавека – працаўніка калгасных і саўгасных палёў, рабочага, інжынерна-тэхнічнага работніка, служачага. У гэтым цяпер заключаецца важнейшая задача савецкага друку» [3].

Тэма цеснага супрацоўніцтва з шырокім аўтарскім актывам асвятлялася на старонках «Мінскай праўды» ў публікацыі «Абласная нарада селькораў». На нарадзе актывістаў друку, куды былі запрошаны і рэдактары раённых газет, з дакладам «Аб асвятленні ў абласной газеце пытанняў развіцця сельскай гаспадаркі і задачах сельскіх карэспандэнтаў» выступіў рэдактар «Мінскай праўды» М. Пузікаў. Пры абмеркаванні даклада сельскія карэспандэнты ўнеслі шмат цікавых прапаноў супрацоўнікам абласной газеты і кіраўнікам раённых газет. Гаворка ішла аб недастатковай увазе выданняў да працоўных дасягненняў заслужаных людзей, перадавікоў вытворчасці, ветэранаў працы. Газетчыкаў крытыкавалі за тое, што лісты няштатных аўтараў залежваліся ў рэдакцыйных партфелях, губляючы аператыўнасць. Грамадскія карэспандэнты звярталі ўвагу рэдакцый на тое, што абавязак газеты – не толькі змясціць крытычны матэрыял, але і дабіцца рэагавання на яго. Ад друкаваных выданняў чакалі і большай падтрымкі насценгазет, чытачы хацелі часцей бачыць на старонках «Мінскай праўды» падборкі сатырычных матэрыялаў пад рубрыкай «Дзяркач», публікацыі з крытыкай перажыткаў мінулага – п'янства, хуліганства, брыдкаслоўя, якія парушалі правілы супольнага жыцця. Селькар пухавіцкай раённай газеты Г. Бакунчык адзначаў, што аўтарскі актыў трэба вучыць уменню пісаць у газету, даваць кансультацыі і парады праз газету ці падчас асабістых сустрэч журналістаў з няштатнымі аўтарамі [4].

Лагічным працягам гэтай важнай тэмы стала публікацыя ст. выкладчыка кафедры тэорыі і практыкі партыйнага і савецкага друку БДУ В. Дубовіка «Думкі аб падрыхтоўцы работнікаў друку». «Некаторыя выпускнікі БДУ, – пісаў аўтар, – прыбыўшы ў рэдакцыю на пастаянную работу выяўляюць здзіўляючую бездапаможнасць:

не могуць сабраць матэрыял нават для карэспандэнцыі, няздольны арганізаваць рабселькораўскі рэйд, губляюцца перад “азамі” паліграфічнай тэхнікі, хоць “назубок” ведаюць тэарэтычныя асновы рэдакцыйнай работы». Па прапанове В. Дубовіка, «адбіраць на журналісцкае аддзяленне трэба ў першую чаргу людзей, якія да пачатку вучобы ўжо звязвалі свой лёс з друкам, папрацавалі ўжо ў газеце або часопісе ці актыўна пісалі туды, выпрабавалі сябе ў журналістыцы і даказалі сваю схільнасць і імкненне да яе» [5].

3 студзеня 1959 г. «Мінская праўда» надрукавала артыкул П. Несцяровіча «Раённая газета і антырэлігійная прапаганда». Супрацоўнік бярэзінскай раённай газеты «Сцяг Леніна» прааналізаваў шэраг публікацый свайго выдання на тэмы рэлігійнага жыцця. Акрамя разгляду рэцэнзій на на новую кнігу «Евангельскія паданні і іх сэнс», артыкулаў «Вера ў варажбу і яе шкоднасць», «Вера ў цуды і рэлігія» і інш., аўтар звярнуў увагу чытачоў абласной газеты на дзейнасць секты так званых «новых хрысціян», якую арганізаваў «фанатычны бадзяга» А. Кушнер. Завербаваўшы ў секту хворых і састарэлых людзей не толькі з Бярэзінскага, але і з суседняга Чэрвеньскага раёна, Кушнер абвясціў іх «выбраннікамі божымі, выратавальнікамі роду чалавечага, апосталамі Хрыста. Яны закінулі сваю гаспадарку, перасталі працаваць, цэлыя дні пачалі праводзіць у малітвах. Некаторыя з іх хацелі ўцягнуць у секту і сваіх дзяцей» [6]. Абапіраючыся на рэальныя факты, аўтар расказаў, як раённая газета асвятляла на сваіх старонках цёмныя справы Кушнера. На прыкладзе дачкі пяцідзясятніцы Клімантовіч – чатырнаццацігадовай Ліды, якая пасля забароны есці мяса, малако моцна захварэла і ледзь не памерла ад недаядання, аўтары публікацый паказалі шкоднасць маралі пяцідзясятнікаў з забаронамі людзям працаваць, не мець сям’і, не лячыцца ва ўстановах аховы здароўя і інш. Раённая газета не толькі змагалася за лёс дзяўчыны, якую прынялі ў дзіцячы дом, але і дапамагла частцы членаў секты вырвацца з абшчыны і вярнуцца да нармальнага жыцця.

У матэрыялах тэматычнай паласы «Друкаванае слова – магутная зброя партыі» («МП», 1959, 11 сакав.), «Рашэнні з’езда – у масы» («МП», 1959, 13 сакав.) абласная газета рэгулярна паведамляла сваім чытачам аб поспехах распаўсюджвальнікаў друкаваных выданняў, прапагандзе рашэнняў XXI з’езда ў раённых газетах «Да новых перамог» (Клецк), «Рудзенская праўда», «Савецкі патрыёт» (Бягомль), «Калектывіст» (Чэрвень) і інш. Абласная газета дбала аб паляпшэнні мовы публікацый:

«работнікі рэдакцый, аўтарскі актыў павінны няспынна ўдасканальваць сваё майстэрста, паляпшаць змест матэрыялаў, пісаць проста і ясна, размаўляць на старонках газет мовай, даступнай шырокім масам» [7]. Шмат парад і заўваг было выказана і ў артыкуле «Зброяй сатыры», дзе быў прааналізаваны змест куткоў сатыры і гумару, фельетонаў на старонках газет «За камунізм» (Барысаў), «Чырвоны сцяг» (Халопенічы), «Калгаснік Заслаўшчыны», «Калгаснік Капыльшчыны» і інш. На аператыўнасць працы раённых газетчыкаў уплывалі і крытычныя па сваім змесце агляды друку. У публікацыі «Павярхоўна і са спазненнем» былі разгледжаны матэрыялы раённай газеты «Рудзенская праўда», якія не толькі моцна адставалі ад ходу ўборачных работ: «істотным недахопам матэрыялаў газеты на сельскагаспадарчую тэматыку з'яўляецца тое, што яны не выяўляюць прычын нездавальняючай работы асобных калгасаў і РТС. У карэспандэнцыях і артыкулах толькі рэгістрыруюцца факты, пералічваюцца недахопы без належнага іх аналізу» [8].

Другая палова 50-х гг. ХХ ст. у гісторыі газеты «Мінская праўда» адзначана шматпланавай і мэтанакіраванай дзейнасцю па ўдасканальванні работы мясцовага друку Міншчыны. Агляды друку, рэйды, якія дапамагалі выяўляць хібы па арганізацыі і распаўсюджванні друкаваных выданняў, цесная сувязь з няштатнымі аўтарамі, праблемы паляпшэння мовы і стылю публікацый, аналіз найважнейшых палітычных і сацыяльна-эканамічных кірункаў развіцця рэгіёна ў выданнях, перадачах заводскага радыё, выпусках насценных газет сведчаць аб фарміраванні ў пасляваенныя гады практычнай школы журналісцкага майстэрства ў сталічнай вобласці, аб'яднаўчым цэнтрам якой з'яўлялася газета «Мінская праўда».

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Шкулёў А.* Агнём сатыры // Мінская праўда. 1958. 11 ліп.
2. Увагу хімічнай прамысловасці // Мінская праўда. 1958. 22 ліп.
3. Важная тэма // Мінская праўда. 1958. 13 снеж.
4. Абласная нарада селькораў // Мінская праўда. 1958. 17 снеж.
5. *Дубовік В*. Думкі аб падрыхтоўцы работнікаў друку // Мінская праўда. 1958. 20 снеж.
6. *Несцяровіч П*. Раённая газета і антырэлігійная прапаганда // Мінская праўда. 1959. 3 студз.
7. *Ярашэвіч М*. Аб мове раённых газет // Мінская праўда. 1959. 6 чэрв.
8. Павярхоўна і са спазненнем // Мінская праўда. 1959. 2 жн.